План-канспект
урока матэматыкі
па тэме “Множанне мнагазначных лікаў на адназначны лік” IV клас

Шапран І.І., настаўнік пачатковых класаў
ДУА “Бабрыкоўская сярэдняя школа” Пінскага раёна

Задачы:
стварыць умовы для азнаямлення вучняў з прыёмам вуснага множання мнагазначнага ліку на адназначны на аснове іх разраднага саставу і множання ў межах сотні;
арганізаваць працу па адпрацоўцы вылічальных навыкаў;
садзейнічаць развіццю мыслення, памяці, увагі, выхаванню культуры зносін у працэсе вучэбнага ўзаемадзеяння.

Ход урока
І.Арганізацыйны этап
Празвінеў званок,
Пачынаецца ўрок.
Слухаем, запамінаем,
Ні хвілінкі не губляем!
Жадаю вам добрага настрою і плённай працы.
ІІ.Праверка дамашняга задання (С.47 №9, І частка)
Што неабходна было ведаць, каб рашыць задачу? Які адказ задачы? Што даведаліся ў першым дзеянні? Колькі старонак у кнізе?
З дапамогай сігнальных картак вучні ацэньваюць, наколькі цяжка было рашаць задачу:
зялёны – лёгка;
сіні – адчувалі цяжкасці;
чырвоны – не выканалі.
ІІІ.Вуснае лічэнне
На дошцы запісаны лікі і выразы. Вучні выконваюць заданні, настаўнік па меры іх выканання прымацоўвае на дошцы карткі з літарамі слова «поспехаў».
1.Знайдзі лішні лік.
23235, 67431, 34437, 75331, 26789 (у астатніхліках у разрадзя дзясяткаў 3), 98231 – п
2.Прадоўжы рад лікаў.
1100, 1600, 2100, 2600, … (3100) – о
3.Знайдзі значэнне выразу.
5160+1250= (6410) – с

4.Знайдзі лік, у якім змяшчаецца 9 адзінак III разраду.
4945, 9567, 139789 – п
5.Знайдзі лік, які меньшы за лік 1050 на 224. (826) – е
6.Назаві лік, які меньшы за лік 4689 у 9 разоў. (521) – х
7.Трэцяя частка даўжыні адрэзка роўна 27 см. Знадзі даўжыню ўсяго адрэзка. (81 см) – а
8.Стораны прамавугольніка роўны 12 см і 8 см. Старана квадрата 4 см. На колькі см перыметр прамавугольніка большы за перыметр квадрата? (На 24 см) – ў
Якое слова ў вас атрымалася?
А зараз некалькі пытанняў. Будзьце ўважлівыя.
1.На талерцы ляжала 5 яблыкаў. Бабуля дала па аднаму яблыку ўнукам. На талерцы застаўся адзін яблык. Ці магчыма гэта?
2.Аўтамабіль праехаў 40 км. Колькі км праехала кожнае кола?
3.Два бацькі і два сыны падзялілі 3 апельсіны, і ў кожнага аказалася па адным. Як гэта магчыма?
4.У каробцы 40 цукеркаў. Чаму роўна палова паловы?
Работа з ЭСН (Практыкаванне «Знайдзі разрадныя складаемыя»)
Фізкультхвілінка для вачэй
Мэтавызначэнне
IV.Этап засваення і прымянення новых ведаў і спосабаў дзеянняў
Практыкаванне ў вусным множанні лікаў (заданне ў рамцы, №1, с. 49)
Рашэнне састаўной задачы №2 з апорай на чарцёж (на дошцы)
Заданні ад Нязнайкі. (Работа ў парах)
Нязнайка навучыўся пераўтвараць велічыні. А цяпер ён вырашыў праверыць вашы ўменні.
Вучні самастойна выконваюць заданні на картках рознага колеру, затым звяраюць адказы.
Вырaзі ў метрах – 56 км 200м, 7 км 75 м, 200 дм, 5 м 20 дм.
Вырaзі ў сантыметрах – 7 дм 6 см, 2 м, 7 м 50 см, 40 дм 50 см.
Вырaзі ў мінутах – 3 г 20 мін, 420 с, 7 мін 60 с, 800 с.
Фізкультхвілінка
Работа з ЭСН (Практыкаванне «Выканай множанне», заданні №7 і 8)
Запішы лік, у якім…(заданне № 8, с.49)
Самастойная праца (вылічы, № 9, 1 слупок), 2 слупок – вучань на дошцы з каменціраваннем.
V.Падвядзенне вынікаў
З якім новым прыёмам мы пазнаёміліся сёння на ўроку і вучыліся прымяняць?
VI.Дамашняе заданне
С.49, задача № 10 (тлумачэнне), № 11 (параўнаць велічыні)
VII.Рэфлексія «Кветачкі»

На дошцы прымацаваны кветачкі зялёнага, жоўтага і чырвонага колераў. Калі вучні справіліся з усімі заданнямі з лёгкасцю, яны бяруць зялёную кветачку. Калі некаторыя заданні былі цяжкімі – жоўтую. А калі на ўроку ім было складана – чырвоную.